# Тварыць разам з дзецьмі



**Тварыць і ўдасканальвацца. Такое педагагічнае крэда выбрала Марына Генадзьеўна Галонская, педагог дадатковай адукацыі Гродзенскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі. Асноўны прынцып яе работы — не быць абыякавым.**

Педагог дадатковай адукацыі ў разуменні Марыны Генадзьеўны — гэта не спецыяльнасць, а лад жыцця, хобі, якое стала лёсам. Для яе важна бачыць радасць у вачах сваіх вучняў. Удзельнікі "Рукадзельніцы" — гэта хлопчыкі і дзяўчынкі з адкрытым творчым поглядам на свет і залатымі рукамі. Праўда, хлопчыкам і дзяўчынкам падабаецца рознае. Хлопчыкам падабаецца працаваць над мадэлямі аўтамабіляў, ваеннай тэхнікі і арыгамі. А дзяўчынкі любяць працу з мяккай цацкай і пацеркамі. Але вынік адзін — работы, у якія ўкладзена радасць творчасці, не могуць не радаваць сваёй прыгажосцю і неардынарнасцю. А калі яны займаюць прызавыя месцы на конкурсах, што бывае не так ужо рэдка, радасці выхаванцаў Марыны Генадзьеўны няма мяжы, бо заслужанае прызнанне — лепшая ўзнагарода.

— У кожным вырабе, выкананым сваімі рукамі, часцінка нашага сэрца, гэта праяўленне нашай індывідуальнасці, гэта наша творчасць, — разважае Марына Генадзьеўна. — Індывідуальнасць вельмі важная ў эпоху глабалізацыі сусветнай культуры. Для падлетка, дзіцяці гэта важна ў перыяд фарміравання ідэнтыфікацыі, самавызначэння. Можа, для некага работа педагога дадатковай адукацыі штодзённая і манатонная, але для мяне гэта нешта іншае. Гэта ўважлівы і зацікаўлены погляд, пытанне, зададзенае з цікавасцю. Гэта першыя памылкі і першыя перамогі, гэта той поспех, да якога мы імкнёмся разам. Бачыць, як мае вучні авалодваюць новымі ведамі, — адна з найвышэйшых узнагарод для мяне як педагога. Працуючы з дзецьмі, я адчуваю сваю патрэбнасць і значнасць. Акрамя таго, авалодаўшы мастацкімі здольнасцямі, дзіця атрымлівае падтрымку і станоўчую ацэнку з боку аднагодкаў і дарослых. Удзел дзяцей у конкурсах і выставах мастацкага і дэкаратыўна-прыкладнога напрамку дазваляе атрымаць грамадскае прызнанне.

І сапраўды, вучні Марыны Генадзьеўны з'яўляюцца прызёрамі шматлікіх конкурсаў і фестываляў. У мінулым годзе яшчэ адзін добры вынік — 3-е месца ў абласным этапе конкурсу "АрхНавацыя-2019".

**Таццяна БАШМАКОВА,**
**метадыст Гродзенскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі.**